Успаміны ўдзельнікаў Саюза беларускіх патрыётаў — нелегальнай арганізацыі студэнтаў, якія ў 1945—1947 гг. аб'ядналіся супраць русіфікацыі і далі прысягу служыць Бацькаўшчыне (стар. 3)

СВАБОДА

Год заснавання 1902
Выходзіць з 1990
Галоўны рэдактар Ігар Германчук
Заснавальнік Павел Жук
Наклад 34.240
Адрас рэдакцыі:
220088, Мінск, вул.Іванаўская, 56
Тэл./факс 2 362 441

Серада, 16 ліпеня 1997 г. № 76 Кошт свабодны

Перамовы: другі раўнд пачаўся

Учора пачаліся перамовы паміж прадстаўнікамі адміністрацыі Лукашэнкі і Вярхоўнага Савета пры пасрэдніцтве місіі Еўрасаюза.

Прадстаўнікам кіруючага рэжыму давялося «трымаць удар» удвух, паколькі трэці член іхняй каманды — Іван Пашкевіч — замест перамоваў сядзеў у лукашэнкаўскай адміністрацыі на нарадзе па праблеме ўступных экзаменаў у ВНУ. Відаць, гэта для Пашкевіча — больш важнае пытанне.

Другі раўнд перамоваў пачаўся з таго, чым месяц таму закончыўся першы. Як вядома, падчас першага раўнда бакі ўзгаднілі ўсе працэдурныя пытанні, за выключэннем аднаго пункта рэгламента: якую ж канстытуцыю браць за аснову. Удзельнікі перамоваў адмаўляюцца ад усялякіх каментарыяў для прэсы. Але з неафіцыйных крыніцаў стала вядома, што міністр замежных справаў І.Антановіч прапанаваў запісаць у рэгламенце: «Мэтаю перамоваў з'яўляецца ўдасканаленне Канстытуцыі», — не ўдакладняючы, якой менавіта. Прадстаўнікі Вярхоўнага Савета запатрабавалі ўдакладніць, што ўдасканаленню можа падлягаць толькі Канстытуцыя 1994 г. Зрэшты, прадстаўнікі ВС выказалі гатоўнасць згадзіцца з фармулёўкай Антановіча — але пры ўмове, што ўлады ў гэты ж дзень прадаставяць прадстаўнікам Вярхоўнага Савета жывы эфір на радыё і тэлебачанні, каб яны атрымалі магчымасць самі выказаць свае пазіцыі перад грамадзянамі Беларусі. На момант здачы нумару ў друк пытанне яшчэ не было вырашана.

Другі раўнд перамоваў працягнецца да пятніцы ўключна. Трэці раўнд пачнецца ў канцы ліпеня.

Вадзім КАЗНАЧЭЕЎ

Прэзідэнт заняў яшчэ адну чаргу

Як паведамілі ў прэс-службе міністэрства замежных справаў, 18 ліпеня міністр Іван Антановіч збіраецца з афіцыйным візітам у Сірыю і Туніс.

Прэзідэнт Лукашэнка неўзабаве прыме даверчыя лісты ад паслоў Ірака і Зімбабвэ. У канцы года Рыгоравіч збіраецца наведаць Паўднёва-Афрыканскую Рэспубліку. Аднак лепш не забягаць наперад, бо аб'яўлены раней візіт прэзідэнта Лукашэнкі ў Індыю так і застаўся яго прыгожай марай. Ці будзе чарга ў ПАР карацейшай за чаргу ў Індыю?

А.Д.

Зэкі напалі на канвой

Тры чалавекі загінулі і восем параненыя

Пяцёра салдат унутраных войскаў параненыя ў выніку інцыдэнту, які адбыўся ў мінулую нядзелю на вакзале ў Баранавічах.

У спецвагоне, у якім пераводзілі злачынцаў, адзін з іх папрасіўся ў прыбіральню. Як толькі адчыніліся дзверы камеры-купэ, пяцёра бандытаў кінуліся на канвой з нажамі і «заточкамі». Начальнік каравула, ацаніўшы сітуацыю, загадаў адкрыць агонь на паражэнне. У выніку сутыкнення пяцёра салдат канвою параненыя, двое з іх — цяжка. Адзін злачынца загінуў на месцы, двое памерлі ад ран, яшчэ трое параненыя.

БелаПАН

Беларускі ліцэй бароніцца ад Івана Ціцянкова

Учора ў Мінску каля Беларускага гуманітарнага ліцэя была паўтораная акцыя пратэсту бацькоў і вучняў, якія не пагаджаюцца на перадачу будынка ліцэя ўпраўленню справамі прэзідэнта.

На здымку: пікет каля Беларускага гуманітарнага ліцэя.

Да лозунгаў, якія былі выкарыстаны пікетчыкамі ў панядзелак, дадалося некалькі новых. Найбольш трапным журналістам падаецца плакат, на якім напісана: «Ліцэй — гэта там, дзе вучаць, а не там, дзе лічаць».

На ўчарашняй прэс-канферэнцыі дырэктар ліцэя Уладзімір Колас паведаміў, што з'явіўся першы вынік абарончай кампаніі, якую пачалі бацькі і вучні. Гэтым вынікам можна лічыць тое, што на кантакт з кіраўніцтвам ліцэя выйшаў намеснік упраўлення адміністрацыі будынкаў кіраўніцтва справамі Аляксандр Сцяпук. Наведаўшы дырэктара ліцэя, ён запэўніў, што гаворка не ідзе аб ліквідацыі ліцэя як установы і прапанаваў у якасці замены будынак Рэспубліканскага дома тэхнічнай і мастацкай творчасці моладзі, які знаходзіцца па вул.Славінскага, 12. Па словах Сцепука, дом творчасці перасяляюць у іншае месца. Між тым дырэктар гэтай установы спадарыня Раманько, з якой звязаўся па тэлефоне Уладзімір Колас, паведаміла, што атрымала ад чыноўнікаў з ведамства Ціцянкова гарантыі, быццам дом творчасці са Славінскага нікуды не пераедзе. *«Атрымліваецца, што нас хочуць сутыкнуць ілбамі, каб мы пагрызліся паміж сабой, а чыноўнікі, тым часам, вырашаць свае справы»*, — так ацэньвае сітуацыю дырэктар Беларускага гуманітарнага ліцэя. Ён заявіў, што ні бацькоўскі камітэт, ні кіраўніцтва ліцэя не пагаджаюцца ні на якія «пераяздныя» варыянты і працягваюць барацьбу за захаванне за ліцэям будынка па вуліцы Кірава. Учора, як і ў панядзелак, міліцыя не перашкаджала пікетчыкам, хаця і ўгаворвала іх разысціся.

Алег ГРУЗДЗІЛОВІЧ

Брэст дапаможа лесам

Брэсцкі аблвыканкам вырашыў аказаць гуманітарную дапамогу пацярпелым ад стыхійнага бедства ў суседняй Польшчы.

На той бераг Буга будзе адпраўлена 4 вагоны лесу. Вырашаецца пытанне, які населены пункт у Польшчы найбольш мае патрэбу ў гэтай драўніне.

Брэсцкая вобласць, якая нядаўна пацярпела ад урагану, ужо адрамантавала жыллё ў сваіх населеных пунктах. Засталося аднавіць сельскагаспадарчыя пабудовы. Ураган нанёс вялікі ўрон і лясному масіву вобласці. 180 гектараў лесу давядзецца поўнасцю аднаўляць. На гэтай плошчы дрэвы моцна пакручаныя і паламаныя і таму непрыгодныя для выкарыстання ў будаўніцтве. Аднак сярод лесапавалу можна выбраць і якасную драўніну. Як паведамілі нам у міністэрстве прыродных рэсурсаў, у выніку ўрагану ў Беларусі поўнасцю знішчана 3.342 гектары лесу. На яго аднаўленне спатрэбіцца каля 5 мільярдаў рублёў. Аднаўленчыя работы плануецца пачаць у красавіку наступнага года.

Мікола ВАЙТОВІЧ

Пісьменнікі таксама не здаюцца

У спіс 22-х будынкаў, якія паводле загаду Лукашэнкі перадаюцца ў ведамства Ціцянкова, трапіў і мінскі Дом літаратара. З гэтай прычыны Саюз пісьменнікаў у панядзелак тэрмінова склікаў прэзідыум сваёй арганізацыі.

Старшыня СП Васіль Зуёнак паведаміў, што на працягу года ў Дом літаратара наведваліся розныя праверкі з адміністрацыі прэзідэнта. Кіраўніцтва Саюза пісьменнікаў прадаставіла ім усе неабходныя дакументы на права валодання будынкам. Дом літаратара быў пабудаваны ў 1976 годзе на сродкі літфонда СССР — спецыяльна для Саюза пісьменнікаў Беларусі. Той факт, што будынак з'яўляецца ўласнасцю пісьменніцкай арганізацыі засведчыў, па словах Генадзя Бураўкіна, пры акце перадачы сам Пётр Машэраў, у верныя вучні якога цяпер набіваецца Лукашэнка. Пісьменнікі засыпалі свайго старшыню пытаннямі, па якому праву ў Дом літаратара лезуць розныя прэзідэнцкія завхозы і кантралёры. Зуёнак адказаў, што ў яго няма службы аховы, каб гэтых візіцёраў не пускаць.

На ўсе пісьменніцкія пытанні ўзяўся адказваць адзін з такіх прэзідэнцкіх візіцёраў, галоўны спецыяліст упраўлення адміністратыўных будынкаў Аляксандр Паўлаў. Гэты малады чалавек пачаў тлумачыць пісьменнікам, што ва ўсіх краінах свету дзяржаве належыць 80 працэнтаў будынкаў(?!) і толькі ў Беларусі да апошняга часу гэта было не так. Ведамства, у якім працуе Паўлаў, спецыяльна і створана прэзідэнтам для таго, каб сабраць пад дзяржаўным дахам такія будынкі. Дом літаратара, на думку ціцянкоўскага чыноўніка, пабудаваны за бюджэтныя сродкі і павінен быць на дзяржаўным балансе. І наогул, прэзідэнцкія распараджэнні трэба выконваць — заявіў Паўлаў.

Анатоль Вярцінскі і Аляксей Дудараў зачыталі яму артыкул новага Грамадзянскага кодэксу, у якім запісана, што будынак пераходзіць ва ўласнасць той арганізацыі, якая займала яго на працягу 10 гадоў. Відавочна такі паварот справы для чыноўніка быў нечаканым і ён прызнаўся, што не з'яўляецца юрыстам і не можа адказаць на такое пытанне. Між тым Паўлаў параіў пісьменнікам не ўпірацца, бо наперадзе, маўляў, зіма, а будынак трэба рамантаваць. Для ўсіх прысутных было відавочным тое, аб чым уголас сказаў Ніл Гілевіч: уладам неабходна паралізаваць работу Дома літаратара як грамадскага і культурнага беларускага цэнтра. Але выкінуць нас адсюль яны змогуць толькі пры дапамозе АМОНу, — сказаў Гілевіч.

Альгерд НЕВЯРОЎСКІ

Паводка тысячагоддзя

Пятніца 18 ліпеня абвешчаная ў Польшчы днём нацыянальнай жалобы. Паводка ў паўднёва-заходняй частцы краіны стала найбуйнейшай прыроднай катастрофай за ўсю гісторыю польскіх земляў.

Паводле папярэдніх звестак, 35 чалавек загінула, сотні прапалі без звестак. Як паведамляе прэс-служба Пасольства Польшчы ў Мінску, стыхія разбурыла 160 мастоў, паралізавала рух на 1.300 км дарог, пад вадой знаходзяцца сотні тысяч гектараў сельскагаспадарчых земляў.

Надзвычайную паводку выклікалі бесперапынныя праліўныя дажджы, якія ішлі ў Чэхіі, Славакіі, паўднёвай Польшчы на мінулым тыдні. У выніку з берагоў выйшлі дзве буйнейшыя рэчкі Польшчы — Одра і Вісла, вада заліла дзесятую частку тэрыторыі краіны. Пад вадой поўнасцю або часткова апынуліся сотні вёсак, дзесяткі гарадоў, у тым ліку такія буйныя цэнтры, як Аполе, Вроцлаў, Рацібуж, Кендзежын-Козьле.

Страты ад стыхійнага бедства ацэньваюцца папярэдне ў мільярд амерыканскіх долараў. Аднак, па словах прэм'ер-міністра Польшчы Владзімежа Цімашэвіча, урон настолькі каласальны, што няма сэнсу траціць сілы і сродкі на дакладныя падлікі. Урад выйшаў з прапановай аб унясенні паправак і дапаўненняў у 25 законаў, у тым ліку ў закон аб дзяржаўным бюджэце. Не выключана, што за ліквідацыю наступстваў паводкі заплаціць кожны паляк: распрацоўваецца магчымасць увядзення надзвычайнага падатку. Сёння ў Варшаве на экстранае паседжанне збіраецца Сейм: стыхія вымусіла дэпутатаў перарваць парламенцкія канікулы.

Па ўсёй Польшчы абвешчаны збор харчоў, адзення, грашовых сродкаў для ахвяраў стыхійнага бедства.

Спецыялісты, спасылаючыся на камп'ютэрныя разлікі, сведчаць, што максімум паводкі на Вісле ўжо мінуў. У Варшаве вада заліла нязначныя тэрыторыі, пераважна па правым беразе Віслы. Гістарычны цэнтр Варшавы — Сьрудмесьце — стаіць на высокім левым беразе і не пацярпеў.

Вельмі напружаная сітуацыя ў Вроцлаве. Больш за палову гэтага 700-тысячнага старажытнага горада апынулася пад вадой. Одра, якая цячэ праз увесь горад, моцна разлілася ў абодва бакі. 40 тысяч чалавек з асабліва небяспечных раёнаў горада эвакуаваныя.

Пачынаючы з суботы тысячы жыхароў Вроцлава змагаліся са стыхіяй: насыпалі пясок у мяшкі і выкладвалі на вуліцах барыкады, каб не пусціць ваду. Але гэта не заўсёды памагае: вада цячэ пад зямлёй, праз камунікацыі, пад напорам чыгунныя крышкі каналізацыйных люкаў страляюць, быццам коркі шампанскага, і пачынае біць фантан.

Асноўныя намаганні людзей былі накіраваныя на тое, каб захаваць ад стыхіі гістарычныя і архітэктурныя помнікі Вроцлава. У будынку універсітэцкай бібліятэкі дзеці і жанчыны цягалі кнігі на вышэйшыя паверхі, бо вада пачала прасякаць праз падвал, частка бібліятэчнага збору ўсё ж падмокла. Галоўнае, лічаць у Вроцлаве, што ўдалося ўратаваць гістарычны комплекс на Астрове Тумскім, а таксама звяроў і птушак у Вроцлаўскім заапарку.

(Працяг на стар. 4)

© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

Не тяните с приватизацией жилья

Разработанный в правительстве законопроект «О внесении изменений и дополнений в Законы Республики Беларусь о приватизации жилищного фонда» предполагает внесение ряда изменений в процесс приватизации жилья. Если этот закон будет принят палатами «национального собрания», то приватизация квартир для многих может стать крайне дорогостоящим занятием. Поэтому тем, кто планирует приватизировать свое жилье и хочет избежать серьезных расходов, следует заняться приватизацией побыстрее.

Предполагается, что стоимость объекта приватизации (квартиры) будет определяться в ценах, которые действуют на день подачи заявления о приватизации в зависимости от характеристик объекта. Определять эти цены будет специальная комиссия местной «вертикали» либо та организация, в ведении которой находится жилищный фонд.

Как известно, часть жилой площади приватизируется за квоты, выделяемые каждому человеку. Но если квот не хватает для приватизации всей квартиры, то оставшаяся жилплощадь оплачивается деньгами. В результате, если квот недостаточно, стоимость денежной части будет устанавливаться исходя из рыночных цен на жилье, которые вряд ли сможет заплатить простой белорус.

Ян ГАЛЕВИЧ

Барацьба за «Хлеб»

Шэсць крамаў, цырульня, баня, атэлье, і два будынкі былі прапанаваны да продажу на чарговым аукцыёне камунільнай уласнасці ў Гомелі.

Своеасаблівае саперніцтва паміж чатырма ўдзельнікамі аукцыёна разгарнулася за краму «Хлеб», што знаходзіцца на Кастрычніцкай плошчы. У выніку магазін набыў адзін мясцовы прадпрымальнік удвая па цане, якая ў дзесяць разоў перавысіла пачатковую, і склала амаль чвэрць мільярда. 187 мільёнаў рублёў заплаціла за прадуктовую краму жыхарка Гомеля Н. Адразу дзве крамы за 400 мільёнаў і 1 мільярд 350 мільёнаў рублёў набыло ММП «Тэхнасувязь» з Мінска. Агульная выручка ад аукцыёна склала 2 мільярды 172 мільёны рублёў.

Гэтыя грошы, па словах мэра горада С.Шапавалава, пойдуць на аднаўленне старога жылля.

Уладзімір ВАЛЕЎСКІ

«Шклоўскія навіны» адрадзіліся

У Шклове пасля 3-гадовага перапынку аднавіла выхад незалежная газета «Шклоўскія навіны».

Яе рэдактар Аляксандр Шчарбак, падкрэсліў, што газета па-ранейшаму мае апазіцыйны да сённяшняй улады характар. У першым нумары газета змясціла скандальныя факты з жыцця мясцовай наменклатуры і тых чыноўнікаў, якія са Шклова пераехалі ў сталіцу.

Пакуль газета мае наклад 499 асобнікаў і па фінансавых прычынах будзе выходзіць нерэгулярна. Але рэдакцыя ставіць сабе на мэце зрабіць газету стабільным перыядычным выданнем.

Іван ЗАСАДА

ПОШТА

Дзе той фонд, што нас абароніць

Добры дзень, шаноўная СВАБОДА! Піша вам чалавек сталага веку, хачу падзяліцца сваімі назіраннямі з нізу жыцця за вынікамі апошніх трох гадоў.

У сметніках людзі капаюцца днём (раней гэта рабілася на змярканні).

Гарэлкай (ці яе сурагатамі) гандлююць каля кожнай крамы, на вакзалах, на рынках і нават на скрыжаваннях вуліц.

Самы танны прадукт — гарэлка. Раней яна (1 бутэлька) каштавала ў два разы даражэй за 1 кг сала, а цяпер стала ў два разы танней.

Шмат шуму накont «падманутых укладчыкаў» — тых, якія даверылі свае мільёны ліпавым банкам ці фірмам. І ні гуку не чуваць адносна тых, што збіралі сабе 5—6 тысяч рублёў на працягу 10—20 гадоў у дзяржаўны «Ашчадны банк». У нас, напрыклад, на 1.01.91 было 6 тыс.рублёў, збіралі мы іх на працягу 20 год сумеснага жыцця. Тры гады таму за гэтыя грошы можна было купіць 20 боханаў хлеба. Потым прайшла дэнамінацыя, і грошай стала 600 рублёў. Зараз на гэтую суму ў краме не дадуць нават акрайца ад бохана. І дзе той фонд, што нас абароніць,— ніхто не кажа.

Л.СУДЗІЛОЎСКАЯ,
ветэран працы, г.Гомель

Так не издевались даже фашисты...

Уважаемая редакция! Пишет вам пенсионерка, инвалид II группы. Помогите мне добиться наказания работников милиции, которые издевались надо мной.

11 июня 1997 года после продолжительной и тяжелой болезни умер мой родной брат, похороны обошлись мне очень дорого — только один гроб, самый скромный, обошелся в один миллион рублей, не говоря уже об остальных затратах. А мне приходится еще содержать на своей пенсии не работающую дочь и четырехлетнего ребенка второй дочери. Денег не было даже на хлеб, и я решила продать 13 пачек сигарет у перехода около тракторного завода. И вот 15 июня 1997 г. (через несколько дней после похорон) я вышла с 13-ю пачками сигарет, в 19:30 ни одной пачки сигарет еще не было продано. Возле перехода продавали фрукты с лотков, там выбросили два ящика испорченных бананов. Женщины выбирали гнилые бананы, я тоже выбрала себе несколько бананов. Стала в елочках возле перехода, ела банан, держала сумочку в руке с бананами. Сверху от коммерческого ларька ко мне бежали трое милиционеров в форме. Подбежали, схватили меня, один из них залез в мой карман, отобрали сумочку, вытрясли бананы, взяли под руки с двух сторон и потащили к милицейской машине. У перехода собралось очень много людей, они кричали: не трогайте бабку, ловите банду. Я схватилась за столб и, сколько есть сил, кричала: «У меня умер брат, я инвалид II группы, не трогайте меня». Люди стыдили милиционеров: что вы делаете, не тем вы занимаетесь, не того ловите. У второй бабки отобрали клубнику. Погоняли бабок, продававших семечки. Милиционеры заломали мне руки и потащили к машине. Я потеряла туфли. Подтащив меня к машине, согнули и бросили в «воронок», применяя при этом самые садистские методы. В автомашине начали избивать дубинкой по голове, ногам и спине. Я кричала, голову закрывала руками, но шофер держал мне руки.

Такого садизма, какой проявили ко мне милиционеры Партизанского РОВД, не было даже со стороны фашистов во время войны, которую я хорошо помню, так как наша семья, как и многие другие семьи Смоленщины, были выгнаны немецкими властями с нашей территории и в течение длительного времени нас гнали как скот, но не били.

Неужели у нашей милиции нет более серьезных дел по раскрытию преступлений, кроме как гоняться за незащищенными старушками-инвалидами, которые продадут пачку сигарет себе на хлеб, так как государство не может обеспечить нашу нормальную старость. Сегодня рядовой милиционер получает, видимо, больше, чем инженер на предприятии.

Бил меня дубинкой в машине милиционер с двумя звездочками, его фамилию я потом узнала у дежурного РОВД. Когда меня туда привезли, то завели в каталажку, угрожали мне, оскорбляли, говорили нецензурные слова. Держали меня часа два, я дала им телефон сына, телефон племянника, но они не позвонили. Потом зашел здоровый милиционер с одной большой звездочкой, приказал милиционерам раздеть меня и забрать все сигареты. Они вчетвером раздели меня, сняли плащ и отобрали у меня 13 пачек сигарет.

После садистских упражнений со мной я попала в 5-ю городскую больницу — избитая, с сотрясением головного мозга. В настоящее время я нахожусь в больнице, все тело в синяках. Написала заявление в прокуратуру, но результата никакого.

Прошу редакцию помочь мне привлечь к уголовной ответственности этих работников милиции.

ГЛЕБОВА Вера Ефимовна,
66 лет, г.Минск

Моладзь яшчэ скажа сваё слова

Артыкул Уладзіміра Дорахава «Мода уходящего сезона», апублікаваны ў СВАБОДЗЕ 11 ліпеня, пакінуў у мяне дваякае ўражанне.

З аднаго боку, праблема, якую ўзнімае аўтар, сапраўды існуе — моладзь, на якую апошнім часам усё больш робіць стаўку палітыкі, з'яўляецца вельмі неаднароднай па сваіх палітычных прыхільнасцях, зрэшты, як і любая іншая частка нашага грамадства. І гэта натуральна. Але з некаторымі высновамі і фактамі, прыведзенымі сп.Дорахавым для абгрунтавання сваёй пазіцыі, я не магу пагадзіцца.

Па-першае, імкненне ўсіх палітыкаў прыцягнуць пад свае сцягі як мага больш моладзі з'яўляецца не «модой уходящего сезона», а неабходнасцю. Гэта зразумеў нават Аляксандр Лукашэнка. Але робячы стаўку на такога «цёмнага коніка» як моладзь, выйграе той палітык, хто імкнецца дасягнуць чаго-небудзь рэальнага, а не стварае нежыццядольных фантомы кшталту БПСМ, які развaліцца адразу пасля заканчэння тэрміну прэзідэнцтва Лукашэнкі.

Апазіцыйныя ж рэжыму палітыкі прапануюць канкрэтныя мэты: выйсці на вуліцу, выказаць рэжыму пратэст усімі магчымымі сродкамі і, у перспектыве, прыйсці да ўлады. Таму я не магу пагадзіцца са сп.Дорахавым, бо ў гэтым сэнсе «Вясна-97» усё ж прынесла жаданы вынік — паказала ўладам, што маладыя праціўнікі рэжыма ёсць і іх колькасць няўхільна расце.

«А что если Лукашенко не уйдет через обещанные 12 лет?» — асуджана пытаецца сп.Дорахаў. Лукашэнка — не Божы пасланец і не стыхія. З ім можна і трэба змагацца, а не чакаць пакуль ён сыйдзе сам (як бы не так!)

Дарэчы, я таксама быў на футбольным матчы Беларусь—Шатландыя. І мяне вельмі абурыла, што сп.Дорахаў, як ён піша, не заўважыў на трыбунах ніводнага бел-чырвона белага сцяга. Няўжо ў аўтара настолькі кепскі зрок? Тым больш, што, як толькі ўздымаўся нацыянальны сцяг, да ўладальніка адразу кідаліся некалькі міліцыянтаў і забіралі і яго, і «незарэгістраваную сімволіку». Толькі я бачыў 3 такія выпадкі, а ў адным нават удзельнічаў.

Андрусь ВЕРБОЎСКІ,
17 год, г. Мінск

Зварот Народнага фронту да бацькоў школьнікаў

Шаноўныя бацькі!

15 траўня 1997 г. лукашэнкаўскі ўрад прыняў беспрэцэдэнтную пастанову аб спагнанні з бацькоў платы за карыстанне школьнымі падручнікамі. Бацькі першакласнікаў вымушаны плаціць каля 120 тысяч рублёў, а бацькі старшакласнікаў да 325 тысяч. Лукашэнкаўская ўлада абгрунтоўвае гэтыя патрабаванні тым, што ў дзяржавы нібыта няма грошай.

Але колькі соцень мільярдаў пайшло на шумныя і пампезныя святкаванні 3—5 ліпеня? Колькі патрачана дзяржаўных грошай на «славянские базары», на «патрыятычны саюз моладзі» і на іншыя прэзідэнцкія прапагандысцкія забавы? Урэшце, колькі трыльёнаў ідзе на велізарныя заробкі дзесяткаў тысяч прэзідэнцкіх ахоўнікаў і супрацоўнікаў спецслужбаў?

Лукашэнка распараджаецца гіганцкімі сумамі народных грошай, але гэтыя грошы ідуць на карысць не народу, а рэжыму.

Мы заклікаем бацькоў не паддавацца на вымагальніцтва Лукашэнкі і не плаціць драконаўскія сумы за канстытуцыйнае права на бясплатную адукацыю. Нас з вамі падтрымаюць і настаўнікі і іншыя работнікі адукацыйна-культурнай сферы, якія марна чакаюць ад рэжыму Лукашэнкі належнай матэрыяльнай ацэнкі іхнай нялёгкай працы. Ніводнага рубля антынароднаму рэжыму!

Сойм БНФ «Адраджэньне»

ЗДАРЭННІ

Запой маці – смерць для дзіцяці

У Гомельскай вобласці самы высокі ўзровень дзіцячай смяротнасці вось ужо два гады запар утрымлівае Рагачоўскі раён.

Немаўляты паміраюць з-за таго, што іх бацькі па медычную дапамогу не звяртаюцца або звяртаюцца вельмі позна. Сёлета па віне бацькоў памерлі ўжо трое дзетак ва ўзросце ад аднаго да трох з паловай месяцаў. Прычына аднолькавая: маці гэтых немаўлятак былі ў цяжкім запоі і звярнуліся ў бальніцу ўжо пасля смерці дзетак.

Уладзімір ВАЛЕЎСКІ

Абліў бензінам і падпаліў

У Баранавічах тры чалавекі загінулі ад пажару ў кватэры, якую падпаліў сам гаспадар.

Глава сямейства пасля сумеснай п'янкі і сваркі са сваім 23-гадовым сынам вырашыў адпомсціць свайму крыўдзіцелю. Пасярод ночы ён абліў бензінам уласную кватэру, разбудзіў жонку і двух сыноў і заявіў перапалоханай сям'і, што падпаліць хату, калі старэйшы сын не папросіць у яго прабачэння. Хлопец спрабаваў утаймаваць раз'юшанага бацьку, але той чыркнуў запалкай і кватэру ахапіла полымя, а праз некалькі секунд выбухнула каністра. У агні загінула жонка і старэйшы сын, а сам глава сямейства сканаў ад апёкаў ужо ў шпіталі. Выратавацца ўдалося толькі малодшаму сыну, які разбіў акно і вылез на вузкі карніз пятага паверху, адкуль яго знялі выклікаўшы суседзямі пажарныя.

Альгерд НЕВЯРОЎСКІ

Запаслівы настаўнік

Цэлы арсенал зброі знайшлі супрацоўнікі міліцыі ў доме 50-гадовага настаўніка з Добрушскага раёна, што на Гомельшчыне.

Акрамя двух зарэгістраваных паляўнічых вінтовак за шафаю былі схаваныя: рэвальвер-наган, пісталет Вальтэр узору 1941 года і 9 патронаў да яго, малакаліберная вінтоўка «ТОЗ-8», вінтоўка бельгійскай вытворчасці і 350 малакаліберных патронаў. Гаспадар гэтай зброі заявіў, што частка яе дасталася ў спадчыну, а вінтоўку купіў некалькі гадоў таму ў выпадковага чалавека.

Уладзімір ВАЛЕЎСКІ

КАДРЫ

© PDF: Kamunikat.org 2010
© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

Канвой быў розны, большасць нялюдзкі, але з часам дзяўчаткі іх перавыхоўвалі, і на далёкіх аб'ектах работы можна было з імі вытрымаць. Нават спявалі пад савецкі гімн:

Союз нерушимый зэка и конвоев
Сплотила на дальних объектах Инта.

З кнігі Ларысы Геніюш «Споведзь»

Я шчаслівая і гордая, што блізка ведала Ларысу Геніюш, нашу слынную паэтку, выдатную жанчыну, палымяную патрыётку. Ларыса Геніюш паявілася ў нашым лагеры 385/6 у пачатку сакавіка 1956 года. Мы даведаліся, што прыбыў этап з Поўначы, з Інты ці з Варкуты.

З кнігі Германа Кірылава «Прысягнулі Беларусі»

На алтар Бацькаўшчыны

Успаміны ўдзельнікаў Саюза беларускіх патрыётаў — нелегальнай арганізацыі студэнтаў, якія ў 1945—1947 гг. аб'ядналіся супраць русіфікацыі і далі прысягу служыць Бацькаўшчыне

Анатоль ВЯРЦІНСКІ

У трох апошніх нумарах часопіса «Полымя» надрукаваныя ўрыўкі з дакументальнай кнігі полацкага пісьменніка і журналіста Германа Кірылава пад назвам «Прысягнулі Беларусі». Пісьменнік выступае тут у ролі ўкладальніка, інтэрв'юера і рэдактара, і публікацыя з'яўляецца плёнам калектыўнай працы.

Прызнацца, знаходжуся пад вялікім уражаннем ад прачытанага. Падобнае зведаў, можа, толькі тады, калі ў свой час прачытаў «Споведзь» Ларысы Геніюш ці калі пазнаёміўся нядаўна з новымі творамі Васіля Быкава, у прыватнасці з апавяданнем «Музыкант», дзе герою чуюцца, на фоне ўсеахопнага рэквіему, таямнічыя словы: «Каго хаваюць? — Народ хаваюць».

Пра што кніга «Прысягнулі Беларусі»? Хто і калі прысягнуў? Хто спавядаецца?

Існуе, так бы мовіць, версія Лаўрэнція Цанавы, якую ён агучыў 17 лютага 1949 года ў сваім выступленні на XIX з'ездзе КПБ. Усемагутны шэф Міністэрства дзяржбяспекі БССР дакладваў з пераможным пафасам у голасе: «На тэрыторыі Баранавіцкай, Маладзечанскай, Полацкай і Пінскай абласцей былі выкрыты і ліквідаваны падпольныя антысавецкія нацыяналістычныя арганізацыі, гэтак званыя «Саюз вызвалення Беларусі», «Саюз беларускіх патрыётаў», «Чайка», «Вольная Беларусь» і г.д.» Далей галоўны эмгэбэшнік рэспублікі яшчэ падкрэсліваў, што ўсе гэтыя групоўкі ўзнікалі не самі па сабе, а «былі інспіраваны агентамі імперыялізму».

Згаданы Цанавам Саюз беларускіх патрыётаў і з'яўляецца якраз той арганізацыяй, споведзі — успаміны сяброў якой складаюць кнігу. «Антысаветчыкі», «нацыяналісты», «прыслужнікі імперыялізму»... А паколькі іх судзілі ваенныя трыбуналы і судзілі па артыкулах крымінальнага кодэксу, якія трактуюць «асабліва небяспечныя дзяржаўныя злачынствы», то да пералічаных азначэнняў дадаваліся і такія: «здраднікі Радзімы», «тэрарысты», «шкоднікі». Словам, «ворагі народа».

А кім яны былі на самай справе? І што ўяўляў у сапраўднасці іх Саюз?

Звернемся да кнігі, паслухаем іх саміх.

«Нашу арганізацыю, Саюз беларускіх патрыётаў, кваліфікавалі на судзе як нацыяналістычную, — гаворыць у размове з Г.Кірылавым Васіль Мядзелец, адзін са стваральнікаў СБП. — Па-мойму, у тым асяроддзі, дзе я нарадзіўся і жыў, нацыяналізму не было і ў паміне. Сказаў бы, што якраз наадварот: як і ў большасці беларусаў, у нашых людзей было, як цяпер усведамляю, штосьці бліжэйшае да таго, што абазначаецца словам «тутэйшасць»... Простыя людзі ў масе сваёй не надта ўжо і памяталі пра даўняе, іх пазбавілі памяці пра мінулае. Але ў той жа час гэтыя людзі моцна трымаліся запаветаў дзядоў-прадзедаў, сваіх звычаяў, традыцый, сваёй мовы. І хоць слухалі пропаведзі ў касцёле па-польску, у царкве па-руску, маліліся адпаведна на польскай ці стараславянскай мове, але дома, у сваім асяроддзі гаварылі па-тутэйшаму, на паўночна-заходнім дыялекце беларускай мовы».

«Ствараючы Саюз беларускіх патрыётаў, — працягвае далей В. Мядзелец, — мы не ставілі перад сабой нейкіх асаблівых задач. Найперш дбалі пра нашу Бацькаўшчыну, каб яна аставалася сама сабой, з беларускай дзяржаўнай моваю, з гістарычнай сімволікай — бел-чырвона-белым сцягам і гербам «Пагоня», са сваёй культурай, гісторыяй, каб была сапраўды свабоднай, суверэннай, шчаслівай». Так мала хацелі яны, дзівакі!

Сведчыць Лідзія Мельнік (Несцяровіч), самая юная сяброўка СБП, падчас судовага працэсу (ён пачаўся 16 траўня 1947 года) ёй споўнілася было толькі 17 гадоў. «І ў школе ў Дзісне, і ў прагімназіі, дзе змагла правучыцца толькі год, па-сапраўднаму адчула, што я беларуска, жыву ў Беларусі, што ў маёй Радзімы даўнія карані, што ў нас багатая спадчына, — згадвае ў сваёй споведзі Лідзія. — Я толькі ўваходзіла ў жыццё, а ўжо ва мне абуджаўся, кажучы словамі Максіма Багдановіча, «за краіну радзімую жах». Л.Мельнік лічыць зусім невыпадковым той факт, што якраз у яе на кватэры адбылася сустрэча, на якой, уласна, аформілася арганізацыйна Саюз беларускіх патрыётаў.

«Мне чатыры разы мянялі Радзіму»

І яшчэ адно, важнае ў гэтай жа сувязі, сведчанне, яшчэ адно «паказанне». Гаворыць Тамара Лагун (Барсук): «І тады мне думалася, і цяпер не магу не ўзгадаць пра тое ж. На судзе вельмі часта гучала абвінавачванне сябрам і прыхільнікам СБП у здрадзе Радзіме. Якой Радзіме? Мне за мае 18 гадоў чатыры разы мянялі Радзіму. Да 1939 года ў школе назойліва ўбівалі ў галаву, што мая Радзіма — «велька Польска». З 1939 па 1941 — што СССР, які на справе асацыяваўся з Расіяй. З 1941 па 1944 — Германія, гітлераўскі райх, ну і адначасова як нешта неакрэсленае Беларусь — Беларутэнія. З 1944-га — зноў СССР, Расія. Пра Беларусь, як пра нейкую асобную дзяржаву, увесь гэты час калі і гаварылася, то болей з мэтай прапагандысцкай, дэкаратыўнай. Але я ўжо з дзяцінства засвоіла ад бацькоў і блізкіх мне людзей, шчырых беларусаў, што мая Радзіма ўсё-такі тая зямля, на якой я нарадзілася, на якой жылі мае бацькі, дзяды — прадзеды, што завецца яна Беларуссю. Я любіла, не магла не любіць «наш край, старонку гэту, дзе я радзілася, расла». Я не здраджвала ёй і не збіралася здраджваць. Наадварот, маё сэрца балела за Бацькаўшчыну, забраную, заняволеную, пакінутую без мовы, без гісторыі, без усяго, што даецца Богам, лёсам кожнаму народу. Хто абвінавачваў нас у здрадзе Радзіме? Быў сярод нашых абвінаваўцаў хоць адзін беларус?»

Вось што ўяўлялі сабой насамрэч актывісты і прыхільнікі СБП — «выкрытай і ліквідаванай падпольнай антысавецкай нацыяналістычнай арганізацыі». Вось глеба, на якой узышоў СБП.

А суддзі хто?

Задумаемся на хвіліну над развагамі, якія толькі што пачулі, у прыватнасці над пытаннем, што мучыць вось ужо паўвека школьную настаўніцу Тамару Лагун (Барсук). (Дарэчы, не дае яно спакою і Алесю Амельяновічу, які таксама прыгадвае: «Гэтыя наезджыя людзі судзілі нас ад імя беларускай дзяржавы. Але ж і трох слоў не маглі звязаць па-беларуску»). Сапраўды — а суддзі хто? Хто судзіў (і прадаўжае судзіць)? Хто абвінавачваў (і прадаўжае абвінавачваць)? Хто вучыў (і прадаўжае вучыць) нас, беларусаў, любіць Радзіму і быць верным ёй? І справа нават не ў тым, ці быў сярод тых, берыеўска-цанаўскіх суддзяў (следчых, пракурораў) «хоць адзін беларус». Магчыма, што хоць адзін ды быў. Справа ў іншым, у іншай крыху плоскасці. Цяжка паддаецца разуменню, ніяк не ўкладваецца ні ў звычайныя чалавечыя, ні ў цывілізацыйныя меркі гэтая вось, стаўшая ўжо амаль традыцыяй, сатанінская практыка — станавіцца паміж беларусам і яго Маці-Радзімай, сварыць і падзяляць іх, адрываць іх адно ад другога. І яшчэ — любоў да Радзімы вызначаць... як дзяржаўнае злачынства, як... здраду Радзіме.

Недарэмна адзін з аўтараў кнігі ўсклікае: «Каб з нашых патрыятычных пачуццяў ды зрабіць нейкі крымінал!» А другі пытаецца: «Па-вашаму, любіць Радзіму, хацець ёй дабра — злачынства?»

Сустрэча з Цанавам

Яшчэ адну грань усяго таго ж, па сутнасці, праклятага пытання закранае знаёмы ўжо нам Васіль Мядзелец. Паколькі ён быў адным з ініцыятараў стварэння СБП і кіраўніком яго Глыбоцкай групы, ім у сумнавядомай «амерыканцы» заняліся асабліва грунтоўна. І вось падчас аднаго допыту, чарговага выбівання прызнанняў (на чыю разведку працаваў? праз каго ішла сувязь? і г.д.) на дапамогу следчаму з'явіўся сам Цанава, прыгразіў: «Пачаму нэ расказывайш? У нас здэс каждый расказывайт. И ты давай! Па-харошаму! Врэмя, панымайш, работайт нэ на вас! Врэмя работайт на нас!» «Калі ён выйшаў, — працягвае ўспамінаць В.Мядзелец, — мне падумалася: ого, столькі ўвагі нашаму сціпламу СБП! Сам Цанава, намеснік Берыі ў Беларусі, намі цікавіцца. Відаць, маюць план зрабіць з нас злачынцаў буйнога маштабу. А тады накацілася горкая, тужлівая роспач. Вось, ратуюць Беларусь ад ворагаў адзін рускі, другі грузін. А ворагі хто? Я, мае сябры — усе беларусы, тыя якраз, хто падняўся за бедную сваю Радзіму...»

Та-а-к... Трапна падмеціў пяцьдзесят гадоў таму, летам сорак сёмага (юбілейная дата!), дзевятнаццацігадовы вязень эмгэбэшнага засценка Васіль Мядзелец гэты вось дзіўны, надзвычай жывучы і актуальны па сённяшні дзень беларускі парадокс: ворагі Беларусі — гэта яе сябры, апекуны ды абаронцы, а яе сыны, яе сапраўдныя патрыёты — гэта, аказваецца, яе ворагі. Вось тут і прысягай ёй. Вось тут і крычы да хрыпаты: «Жыве Беларусь!»...

«Уступаючы ў Саюз беларускіх патрыётаў, прысягаю...»

Ва ўспамінах герояў кнігі «Прысягнулі Беларусі» прыведзена шмат звестак, якія пераканаўча паказваюць, як, у якіх абставінах узнік Саюз беларускіх патрыётаў, што тут паслужыла непасрэдным матывам. «Гэта была рэакцыя школьнікаў і студэнтаў на русіфікацыю, была адна з формаў пратэсту супраць дыскрымінацыі беларускай мовы ў навучальных установах. «Дырэктар школы загадвае ўсім выйсці на калідор і пастроіцца ў лінейку. Пастроіліся. Фішкін камандуе са злавеснай строгасцю: «Кто против русского языка — шаг вперед!» Мы не зварухнуліся. Фішкін папраўляецца, камандуе па-іншаму: «Кто не желает заниматься на русском языке — шаг вперед!» Спадзяваўся, што мы спалохаемся. Але мы ўсе, не змаўляючыся, дружна зрабілі крок наперад»... Так адбывалася — паводле расповеду ўдзельніцы падзей Алесі Фурс (Умпіровіч). Так пачыналася згуртаванне зняважаных у сваім нацыянальным пачуцці маладых людзей і стварэнне нелегальнай — хаця і «бяскрыўдна-рамантычнай па сваіх намерах», як яны прызнаюцца — патрыятычнай арганізацыі.

«Прысягнулі Беларусі»... Так яно было насамрэч. І не толькі ў маральным, але і ў літаральным сэнсе гэтых слоў. Бо, уступаючы ў Саюз, глыбоцкія і пастаўскія навучэнцы ўрачыста прымалі прысягу наступнага зместу: «**Я, (кожны называў сваё імя і прозвішча), уступаючы ў Саюз беларускіх патрыётаў, прысягаю перад Бацькаўшчынай і беларускім народам, што заўсёды буду верны ідэалам свабоды і незалежнасці Беларусі. Калі ж я па слабасці сваёй або па злым намеры парушу гэтую прысягу і выдам тайну сяброў, хай пакарае мяне Бог ганебнай смерцю здрадніка Радзімы»**. І нягледзячы на ўсе выпрабаванні, на ўсе нягоды, пакуты і знявагі, што давялося ім зведаць, яны доўгія гады, нават дзесяцігоддзі заставаліся вернымі сваёй юначай прысязе. «Здаецца, і мучылі нас, дамагаліся, каб мы зракліся сваіх перакананняў, зракліся Бацькаўшчыны, а мы па-ранейшаму заставаліся патрыётамі», — кажа сёння адзін з іх. «Закраналі, разумеецца, і асабліва пякучую больку — згадвалі пра наш растаптаны, абылганы і як бы зрынуты ў небыццё Саюз беларускіх патрыётаў. Мы і ў гулагаўскім пекле не каяліся, нам не было ў чым каяцца: мы хацелі толькі добрага для сваёй Бацькаўшчыны, для сваіх аднакроўных братоў — беларусаў», — дзеліцца ўспамінам другі. «Прысягалі на вернасць Беларусі, і сёння я стаю на тым святым слове», — дадае трэці.

Ін'екцыя патрыятызму

Абагульняючы гэтыя і сугучныя з імі сведчанні, прыходзіш яшчэ раз да высновы: эпітэты «пакорлівы», «ціхмянамудры», «бязвольны» («Злажыў рукі і чакае ўсё нейкай долі») можна аднесці толькі да беларуса дэнацыяналізаванага. Што ж тычыцца беларуса, які атрымаў аднойчы, так бы мовіць, належную дозу нацыянальнай годнасці, этнічнай і грамадзянскай самасвядомасці, то ён ужо прымае іншую паставу і гаворыць іншым голасам, словамі другога купалаўскага героя («Ёсць жа яшчэ ў мяне сіла... Ёсць жа яшчэ ў мяне сэрца... Ёсць жа яшчэ ў мяне вера...»). Альбо як зазначае ў сваёй «Споведзі» Ларыса Геніюш: «Сапраўдны беларус — чалавек, з дарогі ня зьмыліць, і мэта яго адна: Беларусь».

Вось чаму ўсялякія, рознага паходжання і рознай афарбоўкі, ворагі беларушчыны так баяцца духоўнага і палітычнага абуджэння беларуса, так супрацьстаяць таму, каб ён стаў сапраўдным беларусам — свабодным, паўнапраўным, годным гаспадаром у сваім доме.

Між тым яны, хто «прысягаў Беларусі», аўтары кнігі гавораць у адзін голас (пераказваю сцісла): хопіць жыць дэмагагічнымі, скампраметаванымі лозунгамі ды пагаджацца выстройвацца ў калоны, каб ісці ў «светлую будучыню»; трэба прачынацца нам, беларусам, адраджацца, уставаць з калень, аб'ядноўвацца вакол нацыянальнай ідэі, мацаваць свае традыцыі, множыць сваю матэрыяльную і духоўную спадчыну... «Тады і стане ўсім лепш жыць».

Канчаецца кніга словамі-роздумам аднаго з сяброў Саюза беларускіх патрыётаў і пакутнікаў ГУЛАГа Станіслава Савіка, які сустракае старасць у сваіх ціхіх, зялёных Лужках. Вось яны, гэтыя пранікнёныя і да болю простыя словы: «Гляджу, слухаю, прысеўшы ў вольны час перад тэлевізарам, што адбываецца ў нашай Беларусі. І сум бярэ: калі ж у нас усталюецца нармальнае жыццё? Быццам сам лёс падарыў нам, нам, беларусам, шанц выбіцца на дарогу. Але нас цягне назад, да таго, што было. Не здатныя думаць самі за сябе, не можам быць гаспадарамі ва ўласным доме. Столькі пакут прынята, столькі ахвяр прынесена дзеля таго, каб Беларусь была вольнай і шчаслівай! Няўжо гэта ўсё дарма?»

Няўжо?

Раю ўсім, каму неабыякавы лёс Бацькаўшчыны, пазнаёміцца з кнігай. Балазе, выдавецтва «Наша Ніва» ўжо выпусціла яе асобным выданнем пад назвай «Гарт. Саюз беларускіх патрыётаў», у поўным выглядзе.

У 1947 г. Саюз беларускіх патрыётаў быў разгромлены бальшавіцкімі карнымі органамі. Былі асуджаны 44 сябры арганізацыі, чатыром была прысуджана смяротная кара, астатніх адправілі ў ГУЛАГ...

© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

Паводка тысячагодзьдзя

(Пачатак на стар. 1)

Одра яшчэ не супакоілася

А восьмую Алоліну гарадзіне на Одры, кудой паводка прыйшла на два дні раней, затапіла пакуперлеі аднымі з першых. Вада заліла кухні, мелася і нечакана. Не ўсім жыхарам удалося ўратавацца, проста па вуліцах гораду мясцовае тэлебачаньне чытае тэкст бегатэкста да ўсіх жыхаро. Асобныя будынкі былі поадтопаны да вышаняў трэцяга паверха. Цяпер узровень вады ў Алоні знізіўся ўжо больш як на два мятры, гораду ташчо вярнецца да жыцьця, але па асобных вуліцах нешта нельга нават казаць, адзінаем сродкам перасьмешнома застаюцца чаўны, на дзямянна матрацах, камерах ды аўтамабільных колах.

Одра яшчэ не супакоілася. Кажуць ейныя рабочыя: паказальнікі, што ў асобных мясцовасцях максымум разьлівы будуць прыходзіць на пятніцу і нават на суботу. Да барацьбы са стыхіяй прыцягнуты ўсе — войска, паліцыя, пажарная службы, ды дапамагаюць грамадзяне добрай волі. Але масштабы катастрофы такія, што нават дасведчаныя наглядчыкі-гідралягічнае зьвяртаюцца па дапамогу да ўсіх, хто можа. Самым прывабным сродкам застаюцца мешкі з пяском, вымацаванымі адзін на адзін у сьцяну. У Алоні ў Вроцлаве такіх вежаў-на вежаў сьвяшчалося, пасьля цягам вёрстаў з цэлых кіламетраў, скончыць тольк пачаць выбіраць замяс з-пад іх. Скончыцца мешкі — пайшлі ў ход старэя адзеньне.

Перад тварам стыхіі людзі часта губляюцца і не могуць разабраць адказнага. Вядома, вечарам, кі ноч зьбіраюць на адпачынак людзей з вялізнага затопленага весак, не раз сутыкаюся з сітуацыяй, кай вядзя адбудзяліся пасьцы: ябо забіраюць мяко карову, ябо — застаюся тут. На зазыкулюю кароў і цялятка з задзьбіцку, ведама, не было ні часу, ні сіл, ні таемных магчымасьцяў. Трэба было — выратаваць. На рэшце было, што не пасланаві людзі падзеяда па вердзячкай весцаца на вертаўся. Ці ўдасца яшчэ карова ведь вертварацца ў кучу бярвеньо — і тольк неспа ля дзей і дзяцей.

У мясцу Ланьі каля Вроцлава асабіста прыяджаў прэм'ер-міністр Польшчы Цімашэвіч. Ён праслу людзей, кай тым даводзіл разбуўвацца ваяна бярэзе Одры) пусцаць рэку на пала. Гэта дазволяла б дапамагчы Вроцлаву, ад весці часту вады да гораду — але людзі не зьжадаюся. Прэм'ер абіцяў, што зроб пакоўе усе стаяць, дасць людзям новае жыльё там, дзе яны пажадаюць — не згадзіліся. Сто дваццаць кат з Ланьі ўжо не падужоць. Тыяк ні людзей у Вроцлаве засталіся без жыльля.

Пытанні без адказу

На сёняшні дзень ніхто не можа падлічыць, колькі будзе каштаваць рамонт і адрыхтоўка жыльля. Ствыяк адсутнае, людзі вяртаюцца ў сваё дамы, дзе жыцьцам немагчыма, усё жыхарэ, будаванае, смярдзючае. Нават спецыялісты не могуць спрагназаваць, што будзе з залітымі старымі дамамі ў Алоні, Вроцлаве, іншых гарадах. Пабудаванне нанову жыльлям стагодзьдзя, дамы-ж разу ня

У асобных раёнах Алоліи па сёняшні дзень можна перасоўвацца толькі на чаўнах.

рыторыі некалькіх хімічных прадпрыемстваў. Вада прынесла з тэрыторыі Чэхіі некалькі тон мазуту. Гігіэнічны-эпідэміялягічны інспэктар Польшчы Я. Янішэвіч паведаміў, што ніякіх асаблівага страху нікому ў ваколіцах аб'ёмаў вады канцэнтрацыі хімікатаў невыяўлена. Адзінае, чаго небясьпеку забруджвання падземных водаў — і тады даведзецца зьясьцяць калодзежы, перакрываць вадаправоды у гарадах.

На чыгуначным вакзале ў Кавлавіцах у нядзелю я бачыў сотні людзей, якія ў рослыя стаяці перад расклядам руху цягнікоў, дзе многія радкі былі пазначаны словам «адменены». Да дзеяцца дзяжурнай службы спакойна адказвалі, вымушаі з кожнай праз вокны цягаргаты, адзеньне, прадукты харчаваньня, нашыя сямі плыкуюі асобаюць на гаварок вуліцы. Горача, мокра — усё стаі пачынае гніць, раскатваецца і смярдзіць. Пакуль не зарэгістравана анаюў небясьпечных зарожных хваробаў, але пальчыць сьвятарна-эпідэмічная служба пачала рабіць масавы прышчэпкі», а ў гарадах падвоена дзяжурў гіпіні вадзе.

Пагроза ідзе не толькі з канаізізаваі і дастойнаюі, дадуць вада вымыла нечыстоты. У Вроцлаве размытыя гарадскія могілкі. Пад гаводу тратыя бурнымі сметнікі па тэрыторыі Польшчы, запіты тэрыторыі некалькіх хімічных прадпрыемстваў. Вада прынесла з тэрыторыі Чэхіі некалькі тон мазуту. Гігіэнічны-санітарны інспэктар Польшчы Я. Янішэвіч паведаміў, што ніякіх асаблівага страху нікому ў ваколіцах аб'ёмаў вады канцэнтрацыі хімікатаў невыяўлена. Адзінае, чаго небясьпеку забруджвання падземных водаў — і тады даведзецца зьясьцяць калодзежы, перакрываць вадаправоды у гарадах.

На чыгуначным вакзале ў Кавлавіцах у нядзелю я бачыў сотні людзей, якія ў рослыя стаяці перад расклядам руху цягнікоў, дзе многія радкі былі пазначаны словам «адменены». Да дзеяцца дзяжурнай службы спакойна адказвалі, вымушаі з кожнай праз вокны цягаргаты, адзеньне, прадукты харчаваньня, нашыя сямі плыкуюі асобаюць на гаварок вуліцы. Горача, мокра — усё стаі пачынае гніць, раскатваецца і смярдзіць. Пакуль не зарэгістравана анаюў небясьпечных зарожных хваробаў, але пальчыць сьвятарна-эпідэмічная служба пачала рабіць масавы прышчэпкі», а ў гарадах падвоена дзяжурў гіпіні вадзе.

Без ураджаю

У сёмін хлопаты ніна больш ашы. Тым, кому ўдалося пазачэ ціна і ў каго паводка не зруйнавала дамы, панясла неізьвесныя страты на палетках. Нават там, дзе вада стаяла недзе, ураджай загніў. На сотнях тысяч гектараў збожжа, бульба, гародніна засталіся под слоем гразі, глею, тваіна, сусім-не сметно не прайгрыда да лісця. Зьнішчаны тысячы гаўбуўсяной гаргаталі жывёлы. Уход загінуўшае, што гоіцца. Польшчы не патрэбаў, адзін вядомчна, што цяпер на карты можа ўдастуць.

У Чэхіі, адкуль пачуўся напуст стыхіі, пацярпелі ў асноўным сельскагаспадарчыя раёны. Прыродная катастрофа таксама распаўсюджваецца на самыя вялікая за ўсю гісторыю. З буйным гаворку пад паводку трапіла Астрава. Найбольшую шкоду стыхія прынесла Усходняй Чэхіі «Марыя — рогенам, дзе выроўнаваюцца ленькай гаргаю збожжа і вінаград, асноўнае чэшскага сельскагаспадарчага экспарту. Тысячы чэшскіх фермэраў апынуліся перад пагрозай поўнага банкруцтва. Урад абяцае кампэнсаваць, але яна не пакрые ўсіх страт. Паводкі прынесла разьлеку, праміўрон да падзеяі складае больш за 300 мільярдаў долараў, ае гэта без ўліку страчанага ўраджаю.

Далей, на Дунай

Ходзе паводкі пачала перакідвацца на поўдзень, у бок Дуная. Пад гародам апынуўся Аўстрыя, Венгрыя, Румынія. Калі ў нядзелю я ад'язджаў у Будапешта, Дунай ўжо стаў выходзіць з берагоў вада заліла усе нізкабярэжныя, а плынь несла разам гораду, вялізарныя вывернутыя дрэвы, кусты, кучы смецця. Прасьпяча пачынаюцо нарушэнні чыгуначных зносінаў паміж Венгрыяй, Румыніяй і Польшчай. Цягнік з Будапешту да Катавіц, якім я ехаў, спазьніўся на 15 гадзін. Нагэтай час, ад вады не разьвяла чыгуначныя насыпі, рэйкі і шпалы забітыя тровай і галінамі, каля Славакіі польскай мяжы пасажыры нават дазвалялі жаночым гуракам-славакам самім. Вені рыяй, Будапешт і Польшчай. Цягнік з Будапешту да Катавіц, якім я ехаў, спазьніўся на 15 гадзін. Нагэтай час, ад вады не разьвяла чыгуначныя насыпі, рэйкі і шпалы забітыя тровай і галінамі, каля Славакіі польскай мяжы пасажыры нават дазвалялі жаночым гуракам-славакам самім.

Значныя страты панясе турыстычны бізнес. Прыдуі, курортныя месцы у Чэхіі, Славакіі і Венгрыі знаходзіцца ў перавазнай ў курорты мясцовых і паводка ім не загранкруна. Але, па-першае, цягнік не да дрэчнага, а па-другое — модна падрузьлаюся камунікацый.

Гатая прыродная катастрофа будзе праверкай для усёй Новай Еўропы. Блізкаўны час пакажа, наколькі эфектыўныя і жыцьцяздольныя з чужаюць новыя краіны еўрапейскія структуры. Ні Польшча, ні Чэхія самастойна з бядой не справяцца.

Усеваліад РАГОЙША
Фота: EPA, GW

У Вроцлаве сцены з мікіэту з пясоком будавалі нават манашы.

Narkotiki

Китайская ничья

Боялись третьей мировой войны, демографического взрыва, распознания ядерного оружия и экологической катастрофы. Но беда, как всегда, пришла с другой стороны. Распространение наркотиков стало грозным геополитическим фактором. Наркотики наносятся вьлили из жизни сотньлх людей, что хватило бьл на средних размеров государство.

В Латинской Америке, Юго-Восточной и Центральной Азии наркомафия контролирует границы, тем самым стала под вопрос существование стран. Наркомафия разрушает политическую стабильность и национальную экономику. Почти вся международная преступность в конечном итоге завязана на наркотиках — здесь пространственные рьлнки рьлнок и оптовые от чёрного рьлнка оружия, золота или крадёного антиквариата. Каждую секунду на планете кто-то приобщается к наркотикам, а значит, делается клиентом наркомафии. 300 вен будет сделан прочет о моем наркотиков и наркоторговцах.

Кто виноват? Порочность человеческой натуры, которая всегда ждет чего-то неизвестного и острейшего, не думая об опасности? Или всемирная эпидемия нарастающей психической болезни? А может быть, либеральная терпимость к наркотикам? Так в Германии 20-х годов благородную торговли фашистов...

По-настоящему, на медицинские, не репрессивные меры результатов не дают. Во многих странах Азии беспощадно казнят за горсть зелья, но это не устраивает на наркоманов, на наркоделышков. Последние по времени попытка свердеть ситуацией — договор о международном юридическом сотрудничестве. Американцы считают, что отслеживающее сроя колумбийские наркобароны из территории «подлежат руководить своими синдикатами где наркофирм, там и корпуляя. США требуют от Колумбии выдачи арестованных наркобаронов. Законопроект одобрен в верхней палате колумбийского парламента, и немного, что из этого выйдет. Известно, как протолюстрировали нижние палата. Анаробийские угрожают терактами. Каждый, кто поддерживает закон о выдаче, приговаривается к смерти — написано в листовке, распространенной наркодельцами. Лозунг наркобарона № 1 Пабло Эскобара: «Лучше могила на родине, чем тюрьма в США». Он был убит два года назад во время побега, которая совершили, узнав о розницей ему выдаче американскому правосудию.

Власти китайской провинции Хайнань недавно пошли на мораторий ещё. Там объявлена шестинедельная амнистия для наркоманов и наркоделышков. Тем, кто явится с повинной, обещано «минимальное наказание» (проще говоря, не расстреляют). Кроме того, гражданам пообещают доносить на потребителей и распространителей наркотиков. Китайское законопослушание всем известно, но китайская преступность тоже. Власть предлагает «китайскую ничью» — сбросить с доски все фигуры и начать партию сначала.

Но вряд ли наркомафия согласится играть по таким правилам, тем более что «китайская ничья» — это последний шанс в бездонной позиции. Да и среди детей, играющих в шахматы на переменках.

Д.Д.

Современные стеллажи и стойки
– ТОРГОВЫЕ
– ЭКСПОЗИЦИОННЫЕ
– ОФИСНЫЕ –
ДЛЯ ГАЗЕТ И ЖУРНАЛОВ, ДЛЯ ПАПОК И БУМАГ
ПРОДАЖА ГОТОВЫХ ИЗДЕЛИЙ И ИЗГОТОВЛЕНИЕ ПО ИНДИВИДУАЛЬНЫМ ЗАКАЗАМ
Тел. (017) 210-02-53
факс 236-24-41

© СВАБОДА Падпісны індэкс 63887 E-mail: edit@svaboda.minsk.by СВАБОДА у Інтэрнэце: http:\\www.gis.minsk.by Спасылка на газету СВАБОДА абанэкавана Наклад 34.240
Нумар падпісаны у друк 15.07.97 (15:00) Надрукавана на паліграфічнай фабрыцы «Чырвоная зорка» (г.Мінск, 1-шы Загарадны завулак, 3) ЛВ № 215 Заказ 328

© PDF: Kamunikat.org
© Інтэрнэт-рэсурс: Kamunikat.org